**Януш, І.** Святое месца / І. Януш // Лепельскі край. – 2007. – 3 студз. – С. 2.

# СВЯТОЕ МЕСЦА

У наш час шмат увагі ўдзяляецца выяўленню, вывучэнню, ахове помнікаў гісторыі, археалогіі, культуры. Са шматлікіх паведамленняў газеты «Лепельскі край» даведваемся, што мясцовыя краязнаўцы вельмі настойліва і з поспехам вядуць пошукі новых помнікаў.

Старэйшы помнік горада – Георгіеўскі могільнік – размешчаны на востраве паміж азёрамі Лепельскае і Проша, ракой Эсай і штучна прарытым у XIX стагоддзі першым лепельскім каналам былой Бярэзінскай воднай сістэмы. 3 архіўных дакументаў вядома, што на гэтым месцы стаяла Георгіеўская царква, пабудаваная ў імя св. велікамучаніка Георгія Перамогановсца. Лепельскія храмы часцей будаваліся і будуюцца ў выглядзе карабля або крыжа. У старажытнасці яны яшчэ мелі форму зоркі ці круга. Карабель нагадвае, што царква з'яўляецца суднам, на якім выратоўваюцца вернікі ў жыццёвым моры. Круглая форма – сімвал бясконцасці. А форма зоркі, быццам начны ўказальнік, дапамагае чалавеку ісці з Богам і царкоўнае богаслужэнне найбольш адпавядае духоўным патрэбам веруючых.

Каменная Георгіеўская царква была пабудавана ў 1899 г. 24 ліпеня 1900 г. асвечана протаіерэем (старшым па званню свяшчэннікам) І. М. Даўгяпам. Праз два гады ён пайшоў з жыцця і пахаваны за 20 метраў ад царквы. Па словах сына, вядомага беларускага гісторыка Дзмітрыя Даўгапяты, яго бацька быў паважаным у горадзе чалавекам, які шмат зрабіў па рамонту храмаў, добраўпарадкаванню тэрыторый пахаванняў, кіраўніцтве царкоўна-прыходскімі школамі павета. На магіле ўстаноўлены помнік з чорнага мармуру з надпісам: «Тут спачывае ў міры протаіерэй Іаан Максіміліянавіч Даўгяпа. Памёр 3 лютага 1902 г. на 56-м годзе жыцця». На супрацьлеглым баку помніка – цытата рэлігійнага зместу на царкоўна-славянскай мове.

Зверху захаваўся цыліндрычны стрыжань, на якім мацаваўся крыж. Надмагільны помнік зрушаны з пастамента, але стаіць на трывалым грунце.

Сярод шматлікіх пахаванняў дзесьці знаходзіцца магіла Адама-Людвіка Дзяменцьевіча Юцэвіча, былога выкладчыка гісторыі і геаграфіі Лепельскага дваранскага вучылішча. Вядомы пісьменнік, фальклярыст, краязнавец нарадзіўся ў Літве, скончыў Віленскую епархіяльную рымска-каталіцкую семінарыю. Пяць гадоў працаваў ксяндзом у касцёлах. Потым ён перайшоў у праваслаўе, ажаніўся. У лістападзе 1843 года яго прызначылі выкладчыкам у Лепель: Адначасова даследаваў тут мясцовы фальклор. Памёр Адам Юцэвіч 12 сакавіка 1846 г.

Можа, гэта яго магіла знаходзіцца за два дзясяткі метраў ад былых падвальных збудаванняў старой, драўлянай, даўно разабранай Георгіеўскай царквы і за шэсць метраў ад сучаснай? Тут побач са старадаўняй берлінскай таполяй захаваўся вялікі металічны надмагільны крыж вышынёй каля 1,5 м, арыгінальнай формы. Выкананы ён з брусоў таўшчынёй каля 2 см, шырынёй — 15 см, з выгравіраванымі ўзорамі на канцах і на перакрыжаванні. Гэты крыж своеасаблівай канфігурацыі сфатаграфаваны лепельскім фатографам Мікалаем Другаковым у 1992 г. Такія здымкі ўяўляюць пэўную каштоўнасць для гісторыі нашага краю, з'яўляюцца часткай фотатэкі старажытнасцяў Беларусі (захоўваюцца ў Лепельскім краязнаўчым музеі).

Зараз могільнік з усіх бакоў абнесены драўлянай агароджай. 3 усходняга боку захавалася частка агароджы 1893 г, што мацавалася паміж цаглянымі слупамі. Прыняты мерыт для аховы пахаванняў з паўночнага боку ад размыву вадой. 3 гэтай мэтай уздоўж могільніка ўстаноўлены трывалыя жалезабетонныя пліты, аб якія разбіваюцца хвалі возера.

Кожны чалавек у канцы жыццёвага шляху знаходзіць свой вечны прытулак на могільніку. Абуладкаваны, дагледжаны могільнік можа стаць адным з аб'ектаў наведвання не толькі намі, мясцовымі жыхарамі, але і прыезджымі гасцямі, турыстамі з іншых краёў.

**Ілья ЯНУШ,**
**краязнавец**